**Зінкевіч, А.** Бацькоўскі дом – пачатак усіх жыццёвых дарог / А. Зінкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 7 лют. — С. 2.

## БАЦЬКОЎСКІ ДОМ – ПАЧАТАК УСІХ ЖЫЦЦЁВЫХ ДАРОГ

*Прыцягненне роднай зямлі. Гэта пачуццё ніколі не пакідала Чеслава Якімовіча. І ў хвіліны радасці, і ў моманты, калі навісала смяротная небяспека, перад вачыма заўсёды паўставалі дарагія сэрцу краявіды: родная вёска Пятроўскія, бацькоўскі дом на пагорачку і матуля ў акенцы (углядаецца на бальшак, можа, сыночак у госці спяшаецца).*

З усіх далёкіх дарог, куды б не закідаў лёс Чеслава Зянонавіча, ён заўсёды імкнуўся вярнуцца ў край свайго дзяцінства і ранняга юнацтва, туды, дзе спелілася запаветная мара – лятаць, туды, дзе знаходзіцца пачатак усіх яго жыццёвых дарог. І раней, кожны раз у чарговы водпуск, і цяпер, калі на пенсіі займеў больш вольнага часу, наведванне радзімы для яго – святы абавязак. Звычайна ігнаруе паездку на ўласным аўтамабілі, дабіраецца дадому грамадскім транспартам. (А дарога не блізкая з Расіі, ёсць там такі прыгожы гарадок Шуя). Ад урочышча Барок любіць прайсціся пешшу, каб уволю надыхацца паветрам, настоеным на водары родных палёў, лясоў і азёр, палюбавацца навакольнымі краявідамі. Калі ўдалечыні паказваецца родная вёска, сэрцабіенне пачашчаецца, хада паскараецца, а ў памяці ўсплывае тая часіна, калі адправіўся ў далёкі свет...

Вясковы хлопчык марыў стаць лётчыкам. Пачуўшы гул самалёта, ён з незвычайным хваляваннем углядаўся ў высокі блакіт нябёсаў... У школе Чеслаў вучыўся старанна, захапляўся фізкультурай і спортам, загартоўваўся. Ведаючы, што сын марыць аб палётах, маці Чеслава Станіслава Феліксаўна ўгаворвала: «Лятаць – гэта ж так небяспечна, выбраў бы ты лепей якую-небудзь звычайную, зямную прафесію». На што хлопчык пярэчыў: «У небе столькі прастору, там усім самалётам хопіць месца, каб размінуцца».

У раённым ваенным камісарыяце жаданне юнака прывецілі. Спачатку вердыкт медыцынскай камісіі па адборы ў лётныя вучылішчы ашарашыў, прывёў юнака ў разгубленасць – «Не годны». Але ўсё ж лёсам было яму наканавана лятаць. Камісія нечакана памяняла сваё рашэнне і ўключыла яго прозвішча ў спіс кандыдатаў. Так Чеслаў Якімовіч стаў курсантам Сызраньскага вышэйшага летнага ваеннага вучылішча. І ўжо на першым курсе вылалі яму сур'ёзныя выпрабаванні. Падчас вучэбнага палёту ў верталета, якім ён кіраваў, адказаў рухавік. Але Чеслаў сумеў пасадзіць машыну. «Лятаць любіць, лятае смела», – так характарызавалі яго потым камандзіры. Пасля вучобы служыў у Прыкарпацці, у Бярдзічаве. Адсюль фактычна і пачаліся першыя баявыя вылеты. Гарачых кропак на карце свету было тады нямала. Шугала полымя вайны і ў Афганістане. З іх верталётнага палка патрохі адпраўляліся туды хлопцы. Неўзабаве настала чарга і Чеслава Якімовіча. Упершыню ў жыцці ён убачыў горы. Суровыя, скалістыя, іх вяршыні навявалі нейкія самотныя пачуцці. Верталётчыкаў хутка навучылі лятаць ва ўмовах гарыстай мясцовасці, балансаваць на гранічнай вышыні. У авіяцыі паважаюць прафесіяналаў. Чеслаў Якімовіч хутка асвоіўся ў прафесіі і адапціраваўся да ваенных умоў. Пры выкаканні баявых заданняў дзейнічаў смела, у самых складаных сітуацыях праяўляў мужнасць і знаходлівасць. Як не парадаксальна, але менавіта вопыт вядзення ваенных дзеянняў сфарміраваў асобу лётчыка. Чеслаў Якімовіч стаў адным з самых высокакваліфікаваных ваенных спецыялістаў, камандзірам эскадрыллі. Лётчыкаў такога класа ў Расіі налічваецца чалавек сто, не болей.

Калі вярнуліся з Афганістана, яму сказалі: «Забудзьце ўсё, што там было і працуйце». І ён настойліва працаваў над сабой, асвойваў новыя машыны, вучыў маладых пілотаў. Некалькі гадоў служыў у складзе абмежаванага воінскага кантынгенту савецкіх войск у Германіі. Пасля зноў вяртанне на Радзіму. Шмат усялякіх перыпетый было звязана з развалам Савецкага Саюза. А потым і зноўку – подых вайны. Чачня. Часлаў Зянонавіч камандаваў палком, але ніколі не імкнуўся рабіць кар'еру. Усё ў яго жыцці цякло, як кажуць, сваім ходам. Неяк паўставала перад ім дылема: выбіраць ці Зорку Героя, ці чарговае воінскае званне – палкоўніка. Сціпласць беларуса падобная на цёркінскую, маўляў, згодзен на медаль. А ўзнагароджваць яго было за што – 500 баявых вылетаў у самае вогненнае пекла.

У перыяды чачэнскай вайны Чаславу Якімовічу даводзілася быць не проста ў ролі камандзіра, а камандзіра-бацькі зусім яшчэ маладзенькіх байцоў. Перад адпраўкай у камандзіроўку яны ўсім саставам ішлі ў царкву... А потым, праз колькі часу, вярнуўшыся з вайны, зноў-такі прыходзілі ў храм, каб памаліцца за бязвінна забітых і падзякваць Госпаду Богу за сваё шчаслівае вяртанне. Менавіта дапамога Усявышняга і шчырая вера, лічыць і сёння баявы камандзір, ўратавалі ад бяды, падтрымалі на ўсіх шляхах-дарогах, як у паветры, так і на зямлі.

Мноства ўзнагарод абцяжарваюць вайсковую форму Часлава Якімовіча, але не яны вызначаюць сапраўдную вартасць душы чалавека. Вытокі яго шчырасці, добрасумленнасці, сціпласці, мужнасці тут, на радзіме, на Глыбоччыне. І цяпер, калі ўжо ў Часлава Зянонавіча дарослыя два сыны, падрастае на радасць унучачка, сэрцам наш герой-зямляк ўсё роўна рвецца з расійскіх прастораў на радзімую старану, у маленькую вёсачку Пятроўскія, у домік на ўзгорку з вокнамі на бальшак, дзе з любоўю чакае сына матуля.

**А. Зінкевіч**